# 1. ПОЛЕССКИЙ РЕГИОН КАК ОБЪЕКТ ИССЛЕДОВАНИЯ

*А. Я. Барсук, Д. У. Рунец*
*УА МДПУ імя І. П. Шамякіна (г. Мазыр)*

## НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ РЭАЛІЗАЦЫІ КАНФЕСІЙНАЙ ПАЛІТЫКІ ДЗЯРЖАВЫ Ў МАЗЫРСКІМ ПАВЕЦЕ XIX –ПАЧАТКУ XX стст.

Адным з галоўных кірункаў дзяржавы ў дачыненні да царквы было яе поўнае падпарадкаванне свецкай уладзе, што дакладна прасочваецца ў ліквідацыі эканамічнай і адміністрацыйнай самастойнасці праваслаўнага духавенства ў выніку секулярызацыі маёмасці ў 1764 г. і пераводу на бюджэтны аклад. Зразумела, што пэўныя захады для ажыццяўлення рэлігійнай палітыкі дзяржавы павінны распаўсюдзіцца і на далучаныя беларускія землі. Аднак асаблівасці рэгіёна і асаблівы статус каталіцкага святарства вызначылі адметнасці канфесійнай палітыкі на Беларусі. Па ўказу Сената ад 28 красавіка 1798 г. была створана Мінская рымска-каталіцкая дыяцэзія, кіраванне якой належала кансісторыі.

Аб асноўных накірунках канфесійнай палітыкі на Беларусі ў XIX ст. сведчаць дакументы фондаў 295 – канцылярыі Мінскага грамадзянскага губернатара, 937 – Мінскай рымска-каталіцкай кансісторыі і 1781 – Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыі Нацыянальнага гістарычнага архіва у г. Мінску. Яны ўтрымліваюць указы Правячага Сената ў дачыненні да каталікоў (фонд 937, вопіс 6, справа 60), указы рымска-каталіцкай духоўнай калегіі (фонд 1781, вопіс 26, справы 1-160), пратаколы і журналы пасяджэнняў Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыі (фонд 1781, вопіс 26, справы 162–853), рапарты святарства Мінскай рымска-каталіцкай дыяцэзіі (фонд 937, вопіс 6, справа 61–66), звесткі аб колькасці святароў і вернікаў парафій Мінскай губерніі (фонд 295, вопіс 1, справы 2184, 4537, 6960) і інш.

Архіўныя дакументы дазваляюць акрэсліць мэты канфесійнай палітыкі дзяржавы – ліквідацыя эканамічнай самастойнасці і абмежаванне грамадскага ўплыву шляхам прававой рэгламентацыі дзейнасці святарства.

Дзяржава актыўна ўмешваецца ў гаспадарчыя справы царквы ўвогуле (каталіцкай і праваслаўнай), а духавенства не мае права без дазволу грамадзянскіх улад распараджацца капіталамі і маёмасцю. У расійскім заканадаўстве царкоўная маёмасць раўнавалася з дзяржаўнай. У сувязі з гэтым епархіяльныя кіраўнікі абавязаны былі прадстаўляць поўную інфармацыю аб кляштарах і храмах, колькасці сялян і маёмасці, якой валодалі. Гэтая акалічнасць выразна прасочваецца матэрыяламі інвентароў, справаздач і ведамасцяў маёмаснага стану святарства.

Нацыянальны гістарычны архіў у г. Мінску захаваў значную колькасць інвентароў і ведамасцяў за розныя гады з падрабязным апісаннем не толькі зямельных уладанняў і пабудоў, але і хатняй жывёлы, царкоўных рэчаў і гаспадарчых прыладаў [1; 2].

Напрыклад, інвентар Мазырскага парафіяльнага касцёла Ушэсця Прасвятой Багародзіцы ад 1907 г. згадвае не толькі званіцу, стайню, свіран, куфэрак, зямлі ворнай 16 дзесяцін, сенажаці 11 дзесяцін і "под лозой и водой неудобного сенокосу 3 десятины 3043 сажени", фруктовы сад з 10 дрэў і агарод, хатняй жывёлы "2 кабанчика и свинка" [2, арк. 78], вызначае межы Мазырскай парафіі, што мяжуе з Петрыкаўскай, Капаткевіцкай, Бабруйскай і Оўруцкай, колькасць вернікаў – "тысяч сем", называе капліцы – Барбароўскую, Нараўлянскую, Галоўчыцкую і Ліпаўскую, але і апісвае багадзельню, а таксама падрабязна пералічвае гаспадарчае начынне "сталы, лаўкі, скрыня, вілы, качарга, сякера" і інш. [2, арк.77 адв. – 78].

Для параўнання праваслаўны клір сабора святога Міхаіла ў Мазыры (былога бернардзінскага касцёла Арханёла Міхаіла) карыстаўся зямельнымі ўгоддзямі ў 800 дзесяцін, аднак "по отдаленности земли от церкви земли не пашет, отдает прихожанам и получает четвертый сноп от урожая", атрымліваў бюджэтныя аклады ў памеры 1734 руб. 60 кап. за вылікам 2% на пенсіі, з іх настаяцель меў 588 руб., святар – 490 руб., дыякан – 294 руб., псаломшчык – 161 руб. 70 кап., прасвірый – 39 руб. 20 кап. [3, арк. 5 адв.].

Акрамя таго, духавенства незалежна ад канфесійнай прыналежнасці павінна было дакладваць не толькі аб колькасці прычту і парафіян, народжаных, памерлых, прыбытках і выдатках, але і грамадскіх настроях кліру і вернікаў.

Так, протаіерэй Антоній Савіч, настаяцель згаданага вышэй праваслаўнага Свята-Міхайлаўскага сабора ў "Кнізе запісаў звестак па гісторыі царквы за 1879–1916 гг." спачатку распавядае ўвогуле аб гісторыі праваслаўя ў Мазырскім павеце: "было 5 прыходскіх храмаў – Спаскі, Мікольскі, саборны Міхайлаўскі, Прасвятой Багародзіцы і св. Параскевы, 2 манастыры – Яснагорскі Пятра і Паўла, Параскевіцкі жаночы" [3, арк. 1]. Далей у негатыўным адценні ідзе размова пра распаўсюджанне каталіцтва: "со времени возникновения унии, упадка православия, как в уезде, так и г. Мозыре стал процветать папизм, явился приходской костел и 5 римских монастырей…иезуты успели завоевать в свои руки Юревичский православный монастырь, где была чудотворная икона Божей Матери и обратили в католический. Оттуда стали разбивать свои станы для уловления православных в сети папства. Иезуиты основали свою колонию в Мозыре, завели училище, построили дома, принадлежащие Мозырской прогимназии... Монастыры – Бернардинский, женский Мариавитский, 2 цистеров" [3, арк. 1 адв. – 2].

Такім чынам, яскрава прасочваецца адмоўная пазіцыя праваслаўнага святарства да суседства с каталікамі, якая падмацоўвалася палітыкай дзяржавы. За ўдзел у антыўрадавых выступленнях у 1832 г. зачыняецца бернардзінскі кляштар у Мазыры, будынак касцёла перадаецца пад



МГПУ им. И.П. Шамякина

праваслаўную царкву. Затым у 1864 г. быў скасаваны Кімбараўскі кляштар цыстэрцыянцаў (Кімбараўка – мазырскае прадмесце).

Па словах Савіча "прихожане почти все древнеправославные и состоят в коллегии чиновников, военных, купцов, мещан и бывших помещичьих крестьян, но помещиков православных нет… Нравственная сторона прихожан удовлетворительная, особых преступлений и проступков не замечается, даже не видно пристрастия к пьянству, ни в одном хуторе даже много населенном. Ни в одной деревне не имеется шинков. Если случается встретить нетрезвого, то в городе во время торговых дней или во время свадеб и других семейных торжеств, что случается редко. По умственному развитию проживающие в хуторах крестьяне на низкой степени – открывать у себя школы или отдавать в приходское училище из-за бедности не в состоянии, но грамоты не чураются, а завидуют жителям города, имеющим средства и возможность обучить своих детей грамоте… В Мозыре проживает 2 семейства раскольников, занимаются торговлей и принадлежат к сословью мозырских мещан. Но их пребывание среди православного населения не имеет никакого влияния в религиозном отношениии, они живут миром без миссионерских затей… Магометан в приходе нет, но зато почти весь город состоит из еврейского населения, в руках коих заключается вся торговля и промышленность" [3, арк. 6–7].

На стан 1879 г. Антоній Савіч паведамляе: "в г. Мозыре имеется …римско-католический приходской костел, отстоящий недалеко от Собора, но католиков из мещан очень мало – большей частью помещики, шляхтичи, живущие в хуторе, некоторые канцелярские служащие присутственных мест со своими семействами. В Кимборовке мужской католический монастырь правительством закрыт, а женский существует, но никакого влияния не имеет на православных прихожан" [3, арк. 7 адв.].

Сутнасць дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да каталіцкага святарства вызначае яшчэ ў 1831 г. у запісцы на імя імператара М.М. Мураўёў, будучы генерал-губернатар: "Оно дотоле будет возбуждать обывателей к мятежу, пока решительными мерами не уменьшится его влияние лишением богатства и не отымется право вселять в юные сердца воспитывающихся отчуждение от всего русского". На думку Мураўёва, сродкамі рэалізацыі павінны стаць: закрыццё кляштараў і касцёлаў, што прымалі ўдзел у антыўрадавых хваляваннях, канфіскацыя іх маёмасці, змяншэнне колькасці духавенства ў кляштарах і парафіях, забарона "праздношатания без надлежащих видов по губернии и строгое воспрещение принятия в состав его разных лиц без ведома местного гражданского начальства" [4, с. 6].

У яго справаздачы на імя імператара ў 1865 г. ужо ў якасці генарал-губернатара адзначаецца: "вера того края не есть вера, а политическая ересь, а римско-католические епископы, ксендзы и монахи не составляют духовенства, а политических эмиссаров, проповедующих вражду к

русскому правительству и ко всему, что носит название русского и православного". У сувязі з гэтым Мураўёў прапануе абараняць "господствующую религию путем закона, за исполнением которого должен следить правительственный надзор. Пусть существует польский костёл, но если он будет стремиться к завоеваниям путем нарушения законов государства, ограждающих господствующую религию, то его постигнет кара государства – закрытие" [4, с. 33].

Такім чынам, меры, прапанавыя Мураўёвым, дакладна рэалізуюцца ў жыццё ў выглядзе паслядоўнай прававой рэгламентацыі дзейнасці каталіцкага духавенства.

Архіўныя дакументы дазваляюць прасачыць гэты працэс. Грамадзянскія ўлады вырашаюць не толькі пытанні аб скасаванні кляштараў і перадачы іх маёмасці, але і дазваляюць будаўніцтва ці рамонт храмаў, вызначаюць сумы грашовага ўтрымання духавенства, зацвярджаюць на пасады святарства ці звальняюць і г.д.

Яскравым сведчаннем такой палітыкі з'яўляюцца шматлікія рапарты-хадатайніцтвы ксяндзоў на імя дэканаў і Мінскага епіскапа "у Начальства дозволения для отлучки" [5, арк.66] і інш.

**Літаратура**

1. Ведомость имуществ и капиталов, принадлежащим костелам по Мозырскому уезду, 1866 г. // НГАБ. – Фонд 937. – Вопіс 6. – Справа 104–105.

2. Инвентари костелов Минского, Мозырского уездов Минской губернии за 1907–1914 гг. // НГАБ. – Фонд 1781. – Вопіс. 26. – Справа 1498.

3. Мозырский Михайловский собор. Книга описи сведений по истории церкви за 1879–1916 гг. // НГАБ. – Фонд 735. – Вопіс 1. – Справа 1.

4. *Миловидов, А. Меры, принятые графом М.Н. Муравьёвым* к ограждению православного населения от латино-польской пропаганды в Северо-Западном крае / А. Миловидов. – Вильно: Типография Виленского православного св. Духового Братства. Заречье, 1900. – 35 с.

5. Прошения священнослужителей на тяжелое обращение // НГАБ. – Фонд 937. – Вопіс 6. – Справа 110.

ПУ ім. А.П. Шамякіна